# Адукацыйнае падарожжа Юрыя Юзафа і Караля Станіслава Радзівілаў у 1684–1687 гг.

**А. І. Калтачэнка,**
аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі,
Рэспубліканскі інстутыт вышэйшай школы

*Падарожжы былі сталай і неад'емнай часткай жыцця эліт Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у ранні Новы час. Адной з асноўных іх мэт была адукацыйная. Традыцыя адукацыйных падарожжаў эліты ВКЛ у еўрапейскія ўніверсітэты бярэ свой пачатак у XVI ст., калі ВКЛ перажыло значныя трансфармацыі, якія прывялі да змены падыходу да адукацыі сярод магнатаў. У гэты ж час былі заснаваны новыя навучальныя ўстановы ў Еўропе, якія прапаноўвалі новыя тыпы навучальных праграм, прывабныя для магнатаў. Напрыклад, акадэмія ў Страсбургу распрацавала новыя навучальныя праграмы, якія перанялі не толькі пратэстанцкія гімназіі і ўніверсітэты, але і каталіцкія. Гэта і стала перадумовай узнікнення цікавасці да еўрапейскіх адукацыйных падарожжаў.*

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 12.06.2023.

У XVII ст. колькасць маладых людзей, якія выязджалі з ВКЛ у Еўропу для атрымання адукацыі, дасягнула такіх маштабаў, што можна гаварыць пра ўзнікненне традыцыі еўрапейскага адукацыйнага падарожжа. Увогуле XVII ст. было перыядам росквіту адукацыйных падарожжаў эліт ВКЛ па Еўропе. Веды, якія маладыя людзі атрымлівалі ў лепшых універсітэтах Еўропы, высока ацэньваліся, адыгрывалі пэўную ролю ў будучай кар'еры і выгадна вылучалі маладога чалавека сярод тых, хто не меў такога вопыту.

Магнаты ВКЛ у XVII ст. цанілі добрую практыка-арыентаваную адукацыю, якая ўключала моўны, гуманітарны і вайсковы складнікі. Такая адукацыя давала магчымасць далучыцца да лацінскай пісьмовай традыцыі і адкрывала доступ да вялікай колькасці друкаванай інфармацыі, рыхтавала да публічных выступленняў і дыскусій. Наведванне помнікаў гісторыі і культуры спрыяла знаёмству з традыцыямі іншых народаў. Нельга забываць і пра карысныя знаёмствы, якія можна было завесці падчас адукацыйных падарожжаў. Але адной з найважнейшых прычын паездак ва ўніверсітэты Нідэрландаў, Свяшчэннай Рымскай імперыі, Швейцарыі, Францыі, Італіі было жаданне набыць пэўны аб'ём ведаў, неабходных для выканання функцый на дзяржаўных пасадах, а таксама ведаў, якія спрыяюць палітычнай кар'еры. Пры гэтым усе пералічаныя прычыны не прадугледжвалі атрымання дыплома ці навуковай ступені, а толькі працяглае падарожжа з наведваннем лекцый у некалькіх універсітэтах.

Да сярэдзіны XVII ст. асноўным тыпам замежнага падарожжа з мэтай адукацыі быў «peregrination academica» – падарожжа ў еўрапейскія ўніверсітэты ў традыцыі Сярэдніх вякоў [1]. Асаблівасцю «навуковых перыгрынацый» была падпарадкаванасць усяго падарожжа яго мэце – наведванне аднаго ці некалькіх універсітэтаў. Само падарожжа пры гэтым было толькі сродкам дасягнення яго мэты, на іншыя аспекты падарожжа звярталі значна меншую ўвагу. Некаторыя маладыя магнаты аглядалі славутасці, вайсковыя збудаванні, фартэцыі і г. д. Аднак часцей за ўсё гэтаму надавалася другаснае значэнне.

У сярэдзіне стагоддзя падыход змяніўся, і праграма падарожжаў была пашырана. Узнік новы тып падарожжа – «Grand tour». Згодна з новым падыходам, падарожжа павінна было не толькі прыносіць карысць, але і быць прыемным, паляпшаць густ маладога падарожніка [2]. Акрамя таго, адукацыйны аспект падарожжа ў новай канцэпцыі – гэта не толькі лекцыі, дэбаты, кнігі і канспекты, але і ўдасканаленне жыццёвых навыкаў праз знаходжанне ў еўрапейскім элітарным асяроддзі [3, с. 77]. Гэта значыць, да асноўных мэт падарожжа быў далучаны рэпрэзентатыўна-турыстычны аспект.

Каб лепш убачыць асаблівасці Гранд тураў, разгледзім адно адукацыйнае падарожжа, якое магчыма рэканструяваць дзякуючы дыярыушу, які захаваўся да нашага часу. Гэта адукацыйнае падарожжа Юрыя Юзафа і Караля Станіслава Радзівілаў, якое браты ажыццявілі ў 1684–1687 гг. Адразу адзначым, што Караль Станіслаў меў вялікую схільнасць і любоў да пісьма, таму не дзіўна, што дыярыуш пісаў ён, а не Юрый Юзаф Радзівіл. Пасля сябе Караль Станіслаў пакінуў вялікую эпісталаграфічную спадчыну, акрамя таго, падчас падарожжа ён выпрацаваў звычку штодзённых запісаў, якія працягнуў і пасля вяртання [4, с. 19]. Увогуле, весці запісы падчас падарожжа было характэрна для Радзівілаў, пачынаючы з XVI ст. Да нас дайшло дастаткова шмат дыярыушаў гэтага роду. Падарожныя запісы рабілі Мікалай Крыштаф Сіротка, Юрый, Багуслаў, Альбрэхт, Януш, Міхал Казімір Рыбанька і Геранім Фларыян Радзівілы.

Ад разглядаемага ў гэтым артыкуле адукацыйнага падарожжа Юрыя Юзафа і Караля Станіслава Радзівілаў засталося некалькі дакументаў (дыярыуш падарожжа, невялікая частка карэспандэнцыі з падарожжа, асобныя нататкі, у якіх былі зроблены апісанні гарадоў, «itinerarium»), выдадзеныя пад адной з вокладак у 2011 г. [4].

Юрый Юзаф (1668–1689) і Караль Станіслаў (1669–1719) былі сынамі Міхала Казіміра Радзівіла (1635–1680), гетмана польнага літоўскага і падканцлера літоўскага, і Кацярыны з Сабескіх (1634–1694), сястры караля Яна III Сабескага. Першапачатковую адукацыю яны атрымалі дома, а ў 1679 г. пачалі вучыцца ў Люблінскім езуіцкім калегіуме пад кіраўніцтвам Казіміра Аляксандра Чыхроўскага. Захавалася некалькі лістоў К. А. Чыхроўскага да Міхала Казіміра Радзівіла, якія пацвярджаюць гэта. У лістах змяшчаецца інфармацыя пра засваенне праграмы навучання, стан здароўя маладых Радзівілаў. Акрамя таго, у лістах ёсць інфармацыя пра неабходнасць набыцця пэўных рэчаў і просьбы высылаць сынам гасцінцы [5].

Пасля сканчэння калегіума ў 1682 г. Караль Станіслаў і Юрый Юзаф Радзівілы слухалі прыватныя лекцыі разам з каралевічам Якубам Сабескім. Лекцыі чытаў прафесар права і рэктар Кракаўскай акадэміі Себасцьян Ян Піскорскі [6, с. 559]. З гэтай прычыны, падобна на тое, што Радзівілы шмат часу праводзілі ў рэзідэнцыі Сабескіх у Явораве і вывучалі агульнае і польскае права [7, с. 101–102]. Магчыма, у 1682–1683 гг. Радзівілы наведвалі Кракаўскі ўніверсітэт, аднак пацвярджэнні адсутнічаюць. Радзівілы не сустракаюцца ў спісах кракаўскіх школ, метрыка Ягелонскага ўніверсітэта за 1642–1719 гг. не захавалася. Аднак, улічваючы, што браты разам з каралевічам Якубам Сабескім наведвалі прыватныя заняткі ў Себасцьяна Яна Піскорскага, падаецца малаверагоднай неабходнасць наведваць універсітэцкія лекцыі.

У 1684 г. браты былі выпраўлены ў адукацыйнае падарожжа ў Еўропу, падчас якога Караль Станіслаў пісаў дыярыуш. Радзівілы выехалі ў падарожжа з Кракава, хутчэй за ўсё ў самым пачатку 1684 г. Гувернёрам Радзівілаў падчас падарожжа быў Міхал Казімір Рачынскі, род якога адносіўся да сярэдняй шляхты [8]. Аднак у запісках Караля Станіслава гэты чалавек фактычна не фігуруе, яго імя з'яўляецца толькі ў карэспандэнцыі [4, с. 231].

Вядома, што першапачаткова Кацярына Радзівіл з Сабескіх, якая займалася арганізацыяй падарожжа сваіх сыноў пасля смерці мужа ў 1680 г., планавала выправіць іх у Лёвен, хутчэй за ўсё кіруючыся планамі мужа. Аднак пад уплывам свайго брата Яна III Сабескага яна змяніла маршрут. Фактычна ў Юрыя Юзафа і Караля Станіслава атрымалася падарожжа, якое было кампрамісам традыцый еўрапейскай адукацыі Радзівілаў і Сабескіх. Яны былі адпраўлены ў Італію, а потым пераехалі ў Францыю [4, с. 28].

Выехаўшы з Кракава, маладыя Радзівілы праз Сілезію, Уроцлаў і Франкфурт-на-Одэры даехалі да Берліна, дзе сустрэліся з Людвікай Каралінай з Радзівілаў, жонкай Людвіка Леапольда Гагенцолерна і дачкой Багуслава Радзівіла. Хутчэй за ўсё, гэты візіт быў звязаны не толькі з наведваннем сваячкі, але і з пытаннямі дзвюх ліній роду Радзівілаў, якія пачаліся пасля смерці Багуслава Радзівіла і тычыліся «Нойбургскіх маёнткаў». З Берліна браты праз Дрэздэн паехалі ў Прагу, дзе засталіся на нейкі час і слухалі лекцыі па філасофіі. Захаваліся нататкі, якія рабіў Юрый Юзаф падчас наведвання гэтых лекцый [4, с. 33]. Падобна на тое, што гэта былі прыватныя лекцыі, а не ўніверсітэцкія. Прага пакінула Караля Станіслава пад вялікім уражаннем, ён зрабіў вялікі запіс пра гэты горад, дзе апісаў асноўныя славутасці: касцёлы, кляштары, палацы, сады, будынкі калегіумаў [4, с. 136–138].

У Празе Радзівілы былі нядоўга, праз аўстрыйскі Зальцбург і Інсбрук яны накіраваліся ў Італію. Праз Венецыю Радзівілы даехалі да Падуі, дзе былі іматрыкуляваны 26 мая 1684 г. Разам з братамі ў метрыку былі запісаны М. К. Рачынскі і У. Скалімоўскі. У той жа дзень было запісана яшчэ некалькі выхадцаў з Рэчы Паспалітай. Гэта магла быць світа Радзівілаў ці шляхціцы, якія ехалі разам з імі толькі да Падуі [4, с. 34]. З дыярыуша робіцца зразумелым, што ў Падуі браты былі нядоўга, каля двух тыдняў, а можа і меней. З-за гэтага не вельмі зразумела неабходнасць запісу ў метрыку ўніверсітэта. Магчыма, браты наведалі некалькі асобных лекцый. Галоўнай мэтай іх падарожжа ў Італію быў Турын, дзе яны правялі каля пяці

месяцаў (паміж чэрвенем і лістападам 1684 г.) і вучыліся ў рыцарскай акадэміі [4, с. 251].

У лістападзе 1684 г. яны выправіліся ў Ліён, здзейснілі турыстычнае падарожжа па паўднёвых землях Францыі: Альпы Дафінэ і Праванс, і накіраваліся ў Парыж. У горад браты прыехалі перад Раством, недзе 20–24 снежня 1684 г. Вельмі дзіўна, але ў дыярыушы захавалася толькі некалькі невялікіх запісаў з гэтага этапу падарожжа. У той жа час некаторыя звесткі магчыма знайсці ў дыярыушы братоў Аляксандра Яна і Яна Станіслава Ябланоўскіх, якія таксама падарожнічалі па Еўропе ў 1682–1688 г., прыбылі ў Парыж раней за Радзівілаў і зрабілі некалькі запісаў пра сустрэчы з імі [9].

У Парыжы браты правялі чатыры месяцы. На жаль, невядома, дзе яны вучыліся і жылі. Аднак захавалася дастаткова шмат нататак і запісаў лекцый, якія былі напісаны абодвума братамі. З гэтых дакументаў бачна, што вучыліся браты вельмі ўважліва, рабілі запісы гістарычнага і геаграфічнага зместу, асабліва шмат увагі надавалі геаграфіі і гісторыі Англіі і Францыі [4, с. 37]. Падчас свайго побыту ў Парыжы браты неаднаразова наведвалі версальскі двор. Існуе ліст, напісаны на французскай мове, хутчэй за ўсё Яну III Сабескаму, у якім браты апісваюць сваё наведванне Версаля [4, с. 231].

У першай палове мая 1685 г. Радзівілы накіраваліся ў бок Вялікабрытаніі з дыпламатычнай місіяй. Афіцыйнай мэтай іх выправы было віншаванне Якава II Сцюарта з каранацыяй. Аднак галоўнай мэтай было спадзяванне Яна III Сабескага на дапамогу ў барацьбе з Турцыяй. Аўдыенцыя адбылася 24 мая 1685 г., як занатаваў Караль Станіслаў [4, с. 39]. Пасля аўдыенцыі браты засталіся ў Англіі яшчэ на месяц і наведалі каралеўскія рэзідэнцыі вакол Лондана і Оксфардскі ўніверсітэт. Затым яны паехалі ў Галандыю і Іспанскія Нідэрланды, дзе былі трохі болей за месяц і наведалі галоўныя гарады рэгіёна (Амстэрдам, Антверпэн, Брэда, Бруге, Брусэль, Гаагу, Лейдэн, Ротэрдам, Утрэхт) [4, с. 255–256].

У Парыж браты вярнуліся на мяжы ліпеня і жніўня 1685 г. і да кастрычніка працягвалі вучыцца, перыядычна наведваючы замкі і палацы вакол Парыжа. Недзе на мяжы жніўня і верасня ў Парыж прыехаў канцлер вялікі каронны Ян Велапольскі з пасольскай місіяй. Хутчэй за ўсё, ён перадаў Юрыю Юзафу і Каралю Станіславу інфармацыю пра іх дыпламатычную місію ў Партугалію, куды браты накіраваліся ў канцы кастрычніка. Мэтай была прэзентацыя каралевіча Якуба Сабескага партугальскай інфанце Ізабэле з мэтай далейшага іх шлюбу [4, с. 42]. Маршрут Радзівілаў ішоў уздоўж Атлантычнага ўзбярэжжа Францыі да Пірэнеяў. Гэта адзін з найбольш папулярных маршрутаў на Пірэнейскі паўвостраў, бо ў гэтым раёне горы ніжэй за астатнія месцы.

Пасля пераходу гор яны накіраваліся ў Мадрыд, дзе затрымаліся на мяжы 1685–1686 гг. Затрымка была звязана, акрамя іншага, з чаканнем пашпарта, які мог дазволіць вольна праехаць па заходніх Кастыліі і Эстрэмадуры. Пашпарт браты атрымалі 23 снежня 1685 г. Пасля сканчэння сваёй місіі Радзівілы паехалі на поўдзень і наведалі паўднёвыя і ўсходнія раёны Іспаніі, Севілью, Кардобу, Грэнаду, Валенсію і іншыя гарады і вярнуліся ў Францыю [4, с. 44].

У Парыж браты прыехалі 19 красавіка і знаходзіліся тут каля шасці месяцаў. Яны працягнулі навучанне і шмат увагі надавалі самому гораду, пра што сведчаць вялікія нататкі ў дыярыушы. Напрыклад, Караля Станіслава вельмі ўразіла архітэктурная задумка новай плошчы Перамог, прысвечаная французскім перамогам у Галандскай вайне [10]. У пачатку верасня Радзівілы здзейснілі чарговае падарожжа па ваколіцах Парыжа, наведалі замкі і палацы, а ў кастрычніку 1686 г. адправіліся ў Італію [4, с. 259].

Праз Турын, Геную, Пізу, Фларэнцыю і Сіену яны даехалі да Рыма 6 снежня 1686 г. Праз тыдзень знаходжання ў Рыме выехалі ў Неапаль, адкуль вярнуліся ў пачатку 1687 г. [4, с. 261]. У Рыме браты знаходзіліся чатыры з паловай месяцы. У дыярыушы фактычна пазначаны толькі факт прыбыцця ў горад. Ёсць верагоднасць, што апісанне Рыма існавала, аднак было страчана, бо падаецца малаверагодным ігнараванне ў дыярыушы такога вялікага адрэзку часу [4, с. 45]. Хутчэй за ўсё, тут браты таксама нешта вывучалі. Вядома і тое, што яны былі на аўдыенцыі ў Папы Рымскага Інакенція XI і атрымалі мошчы св. Вінцэнта, якія захоўваліся ў нясвіжскім дамініканскім касцёле, будаўніцтва якога фундаваў Караль Станіслаў [11].

У сярэдзіне мая 1687 г. браты вырашылі вярнуцца ў Рэч Паспалітую. З Рыма праз Балонню і Падую Радзівілы даехалі да Венецыі, дзе знаходзіліся з 5 па 10 чэрвеня. Караль Станіслаў пакінуў дастаткова вялікае апісанне Венецыі ў сваім дыярыушы [4, с. 179].

Далей праз Альпы і Інсбрук 23 чэрвеня браты даехалі да Вены, дзе завяршаюцца запісы дыярыуша. Прычын магло быць некалькі: некаторыя так рабілі, бо лічылася, што нічога новага ў дыярыуш запісана ўжо не будзе, а гарады і мясцовасці былі апісаны ў пачатку падарожжа. Напрыклад, так зрабіла Тэафіля Канстанцыя Мараўская з Радзівілаў, якая скончыла свае запісы таксама ў Вене [12]. Прычынай магло быць і тое, што ў Вене Радзівілаў чакалі нейкія дыпламатычныя справы, тым больш у час іх знаходжання ў Вене там быў пасол Рэчы Паспалітай да імператара Станіслаў Іраклій Любамірскі. Калі гэта было так, то Караль Станіслаў, як і ў выпадку з падарожжам ў Англію і Партугалію, мог проста нічога не запісваць у мэтах сакрэтнасці [4, с. 77]. Магчыма, былі і іншыя прычыны.

Вядома, што 1 жніўня 1687 г. браты прыехалі ва Уроцлаў. Пасля двух тыдняў ва Уроцлаве яны паехалі ў Цепліцы, дзе ў той час знаходзілася каралева Марыя Казіміра Сабеская. Хутчэй за ўсё, яны прадставілі ёй справаздачу пра сваё падарожжа, але мэтай магла быць і спроба Марыі Казіміры выдаць каралевіча Якуба за Людвіку Караліну з Радзівілаў, якая стала ўдавой. У такім выпадку Радзівілы маглі спатрэбіцца як кансультанты [4, с. 77]. Пасля вяртання з Цепліц Юрый Юзаф і Караль Станіслаў праз Уроцлаў паехалі ў Саксонію, дзе наведалі Лейпцыг і Дэсаў. Гэтае падарожжа было звязана з матрыманіяльнымі планамі Юрыя Юзафа, які 3 верасня 1687 г. ажаніўся з прынцэсай Марыяй Элеанорай фон Ангальт-Дэсау. Пасля гэтага з невялікімі прыпынкамі ва Уроцлаве і Чэнстахове ў лістападзе 1687 г. яны прыехалі ў рэзідэнцыю ў Белай, на чым і скончылася іх падарожжа [4, с. 51].

Адукацыйнае падарожжа Караля Станіслава і Юрыя Юзафа Радзівілаў доўжылася больш за тры гады, з 1684 па 1687 г., і сумяшчала адукацыйныя і дыпламатычныя мэты. Магчыма, калі б не дыпламатычныя даручэнні ў Лісабон і Лондан, гэтае падарожжа было б шараговым адукацыйным падарожжам магнатаў ВКЛ па Італіі і Францыі са шматмесячным наведваннем універсітэцкіх заняткаў і аглядам розных цікавых помнікаў і калекцый. Аднак у дадзеным выпадку на адукацыю адводзіліся толькі адносна невялікія прамежкі часу, якія перамяжаліся вялікімі падарожжамі не толькі дыпламатычнага, але і турыстычнага характару.

Такім чынам, маршрут падарожжа Юрыя Юзафа і Караля Станіслава Радзівілаў праходзіў праз землі польскай часткі Рэчы Паспалітай, Брандэнбургіі, Баварыі, Саксоніі, Багеміі, Аўстрыі, графства Ціроль, Італіі, Францыі, Англіі, Іспанскіх Нідэрландаў, Галандыі, Іспаніі, Партугаліі. Шмат часу аддавалася дыпламатычным і турыстычным падарожжам, а адукацыя была дастаткова абмежавана. Усё гэта сведчыць пра тое, што гэтае падарожжа было Гранд турам, які быў дадаткам да атрыманай у Рэчы Паспалітай адукацыі, дазваляў вывучыць асобныя навукі, пазнаёміцца з рознымі еўрапейскімі краінамі і прэзентаваць не толькі сваю дзяржаву, але і свой род розным каралеўскім асобам і іх набліжаным у самых вялікіх еўрапейскіх дзяржавах.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Sokołowski, W.* Studia i peregrynacje Janusza i Krzysztofa Radziwiłłów w latach 1595–1603: model edukacji syna magnackiego na przełomie XVI i XVII w. / W. Sokołowski // Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 1992. – T. 35. – S. 3–35.

2. *Tygielski, W.* Peregrinatio academica czy Grand Tour?. Podróże «do szkół» w systemie edukacji staropolskiej / W. Tygielski // Collegium/College/Kolegium. Kolegium i wspólnota akademicka w tradycji europejskiej i amerykańskiej / red. M. O'Connor, P. Wilczek. – Boston: Warszawa, 2011. – S. 47–63.

3. *Jakuboszczak, A.* O zagranicznych podróżach Janusza Modesta Sanguszki / A. Jakuboszczak // Polski Grand Tour w XVIII i początkach XIX wieku / red. A. Roćko. – Warszawa, 2014. – S. 67–80.

4. *Radziwiłł, K. S.* Diariusz peregrynacji europejskiej (1684–1687) / K. S. Radziwiłł. – Toruń: wyd-wo naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2011. – 302 s.

5. Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве. – Ф. 354. Варшаўскі архіў Радзівілаў. Воп. 5. Спр. 2696. Л. 2–17.

6. *Baczkowska, W.* Sebastian Jan Piskorski / W. Baczkowska // Polski Słownik Biograficzny: w 54 t. / Polska Akademia Umiejętności; red. E. Rostworowski [i inny]. – Kraków: Wrocław, 1981. – T. 26. – S. 559–561.

7. *Barycz, H.* Nowe i stare elementy w wychowaniu rodziny Sobieskich / H. Barycz. – Wrocław: Zakład im. Ossolińskich, 1956. – 127 s.

8. *Dygdała, J.* Michał Kazimierz Raczyński / J. Dygdała // Polski Słownik Biograficzny: w 54 t. / Polska Akademia Umiejętności; red. E. Rostworowski [i inny]. – Wrocław, 1986. – T. 29. – S. 656–658.

9. *Markiewicz, A.* «Grand tour» Aleksandra Jana i Jana Stanisława Jabłonowskich z lat osiemdziesiątych XVII wieku / A. Markiewicz // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego. Prace Historyczne. – 2005. – Z. 132. – S. 57–69.

10. Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве. – Ф. 354. Варшаўскі архіў Радзівілаў. Воп. 11. Спр. 119. Л. 313–314.

11. *Rachuba, A.* Karol Stanisław Radziwiłł h. Trąby / A. Rachuba // Polski Słownik Biograficzny: w 54 t. / Polska Akademia Umiejętności; red. W. Konopczyński. – Kraków, 1987. – T. 30. – S. 247.

12. *Morawska, T. K.* Diariusz podróży europejskiej w latach 1773–1774 / T. K. Morawska. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 2002. – 232 s.

**Анатацыя**

У артыкуле разгледжана пытанне з'яўлення ў сярэдзіне XVII ст. новага тыпу адукацыйнага падарожжа – Гранд тура. У якасці прыкладу Гранд тура другой паловы XVII ст. рэканструявана адукацыйнае падарожжа Юрыя Юзафа і Караля Станіслава Радзівілаў, якое адбылося ў 1684–1687 гг. Галоўнай крыніцай для рэканструкцыі з'явіўся дыярыуш падарожжа, які пісаў Караль Станіслаў Радзівіл падчас знаходжання ў Еўропе.

**Abstract**

The article deals with the issue of the appearance in the middle of the XVII century a new type of educational journey is the Grand Tour. As an example of the Grand Tour of the second half of the XVII century, the educational journey of Jerzy Jozef and Karol Stanislaw Radziwilles, which the brothers made in 1684–1687, is reconstructed. The main source for the reconstruction was a travel diary written by Karol Stanislaw Radziwill during his stay in Europe.